# ПЛАН-КАНСПЕКТ УРОКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў VII КЛАСЕ ПА ТЭМЕ «ПАДАГУЛЬНЕННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА ПА ТЭМЕ «ДЗЕЕПРЫСЛОЎЕ», ЦІ ПАДАРОЖЖА Ў ГОРАД ДЗЕЕПРЫСЛОЎЕ»

Белая Валянціна Сямёнаўна

**Мэта[1]:** мяркуецца, што да заканчэння ўрока вучні сістэматызуюць і паглыбяць веды па тэме «Дзеепрыслоўе»; паспяхова выканаюць заданні, накіраваныя на выяўленне і ацэнку ўзроўню засваення вывучанага матэрыялу па дадзенай тэме.

**Задачы:** садзейнічаць развіццю звязнага маўлення праз арганізацыю групавой, парнай і індывідуальнай працы (камунікатыўная кампетэнцыя); арганізаваць дзейнасць вучняў, накіраваную на выпрацоўку ўмення карыстацца лінгвістычнымі звесткамі з мэтай забеспячэння паўнавартаснай камунікацыі (моўная); стварыць сітуацыі для фарміравання навыкаў стылістычна абумоўленага выкарыстання дзеепрыслоўяў ва ўласным маўленні (маўленчая); садзейнічаць фарміраванню экалагічнай кампетэнцыі на аснове лексічнай тэмы; стварыць умовы для развіцця здольнасці да самаарганізацыі і павышэння матывацыі шляхам ажыццяўлення сумеснага мэтавызначэння і рэфлексіі; развіваць навыкі самакантролю, самаацэнкі (сацыяльная).

**Мэта на мове вучняў:**

Пасля ўрока я *буду ведаць*:

- агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю дзеепрыслоўяў;
- правілы ўтварэння, напісання дзеепрыслоўяў;
- правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі;
- *буду ўмець*:
- правільна ўтвараць формы дзеепрыслоўяў;
- правільна пісаць не (ня) з дзеепрыслоўямі;
- распазнаваць у тэксце дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты, вызначаць іх ролю ў сказах, тэкстах;
- правільна ўжываць дзеепрыслоўі ва ўласным маўленні.

**Тып урока:** абагульненне і сістэматызацыя ведаў.

**Метады і прыёмы навучання:** нагляднЫ, славесны, практычны, часткова-пошукавы, творчы; «Вітанне», «Лінгвістычная карта», «Апорныя словы», лічбавы дыктант «Ці верыце вы, што…», «Выбар», «Пераблытаная схема», «Кластар», «Кыжаванка», «Рабі так, як я», «Творчая майстэрня», «Завяршы сказ», «Лесвіца поспеху».

**Метады зваротнай сувязі:** вучні, выканаўшы тое ці іншае заданне, параўноўваюць яго з эталонам ці правяраюць па ключы, пасля чаго арганізуецца абмеркаванне вынікаў і карэкцыя; настаўнік адзначае моцныя бакі ў выкананай рабоце, дае парады, што трэба зрабіць, каб пазбегнуць памылак і палепшыць вынікі; напрыканцы ўрока вучні і настаўнік звяртаюцца да мэт, пастаўленых на пачатку ўрока, абмяркоўваюць іх дасягненне.

**Абсталяванне:** прэзентацыя, тлумачальны слоўнік, маршрутны ліст з заданнямі *(за кожнае заданне налічваецца пэўная колькасць балаў + дадатковыя балы за правільныя адказы на пытанні)*, карткі для працы на дошцы, у групах, табліцы-памяткі, сігнальныя карткі, карткі з імёнамі вучняў.

Дадаткі. Прэзентацыя

**Ход урока**

I. Арганізацыйны момант. (2 хвіліны).

**Прагназуемы вынік:** стварэнне станоўчага эмацыйнага асяроддзя, увядзенне ў атмасферу беларускамоўных зносін.

**Задачы настаўніка на этапе:** псіхалагічна падрыхтаваць вучняў да ўзаемадзеяння на ўроку.

*Настаўнік:* З прыемнасцю і радасцю вітаю ўсіх! Мы разам – і гэта цудоўна! Спадзяюся, наш урок будзе плённым, пройдзе ў атмасферы даверу і супрацоўніцтва. Падыміце, калі ласка, зялёныя карткі тыя, хто любіць рана прачынацца; хто любіць да апошняй хвіліны паваляцца ў ложку; хто паўтарыў апераджальныя пытанні па тэме «Дзеепрыслоўе»; хто любіць падарожнічаць; тыя, хто на ўрок прыйшоў у добрым настроі. Перадайце свой добры настрой аднакласнікам.

II. Матывацыйна-мэтавы этап. (2,5 хвіліны).

**Прагназуемы вынік:** актывізацыя суб'ектыўнага вопыту вучняў, наяўнасць пазнавальнага інтарэсу, матывацыі, самастойнае вызначэнне мэт урока і яго выніку, жаданне вучняў да свядомага паўтарэння вывучанага матэрыялу.

**Задачы настаўніка на этапе:** актуалізаваць суб'ектыўны вопыт вучняў, апорныя веды і ўменні, сфарміраваць пазнавальную актыўнасць.

[1] У адпаведнасці з методыкай актыўнай ацэнкі.

**Спосабы дзейнасці:** індывідуальная, калектыўная.

*Настаўнік:* Зараз мы адпраўляемся ў падарожжа па горадзе Дзеепрыслоўе. Як вы думаеце, чаму горад мае такую назву? *(Настаўнік агучвае тэму ўрока).* Мы разам з вамі паходзім па вуліцах і праспектах, наведаем парк. А каб не заблудзілі, карыстайцеся маршрутнымі лістамі (яны ляжаць у кожнага на парце), якія будуць вас правільна накіроўваць. *(Настаўнік знаёміць вучняў з маршрутным лістом і ацэначнай картай. Вучні падпісваюць маршрутныя лісты.)* Арыенцір у нас ёсць. Але блуканне без мэты – дарэмна патрачаны час. Таму давайце разам вызначым НаШтоБуЗУ *(на дошцы)*: *я буду ведаць ...; я буду ўмець ... (Вучні фармулююць мэты, настаўнік падагульняе).* Каб у нас усё атрымалася, нагадаю вам правілы працы на ўроку.

*Правілы працы на ўроку*

*1. Адказваем з месца.*

*2. Не баімся памыліцца: не памыляецца той, хто нічога не робіць.*

*3. Не перапыняем таго, хто адказвае.*

*4. Ацэньваем вынікі сваёй дзейнасці праз самаацэнку і ўзаемаацэнку.*

III. Засваенне і замацаванне вывучанага матэрыялу. (Да 35 хвілін).

**Прагназуемы вынік:** прымяненне набытых ведаў для выкананання заданняў па тэме, выяўленне і высвятленне вучнямі сваёй кампетэнтнасці, звязанай з вывучаным матэрыялам, разуменне вынікаў сваёй дзейнасці, усведамленне важнасці супольнай дзейнасці на ўроку.

**Задачы настаўніка на этапе:** арганізаваць мэтанакіраваную пазнавальную дзейнасць вучняў па тэме ўрока, праз дыдактычны матэрыял фарміраваць моўныя, маўленчыя, камунікатыўныя кампетэнцыі, развіваць уменні сама- і ўзаемакантролю, карэкцыі.

**Спосабы дзейнасці:** індывідуальная, работа ў пары, групавая.

*Настаўнік:* Здаецца, мы ўсё прадугледзелі і можна адпраўляцца.

1. Праспект Тэарэтычны. (6 хвілін).

Узнаўленне тэарэтычных ведаў па раздзеле „Дзеепрыслоўе“.

*Настаўнік:* „Дзе сіла не бярэ, трэба розумам надтачыць“, — падказвае нам народная прыказка. Пакажыце свой розум і адкажыце на прапанаваныя пытанні па дадзенай тэме.

**Заданне 1.** Лічбавы дыктант «Ці верыце вы, што...».

***Вучні*** *правяраюць сябе па ключы, ацэньваюць сваю работу, выстаўляюць балы ў ацэначны ліст.* ***Настаўнік*** *цікавіцца вынікамі працы пры дапамозе сігнальных картак, высвятляе, у якіх пытаннях былі зроблены памылкі і чаму, каменціруе адказы[2].(**Вучні** прэзентуюць вынікі сваёй працы).*

2. Плошча Словаўтваральная. (6 хвілін).

Паглыбленая праца над тэарэтычнымі ведамі і практычнымі ўменнямі; кантроль узроўню ведаў, уменняў і навыкаў вучняў.

Настаўнік: Малайцы! Вы справіліся з заданнем, і мы рухаемся далей.

- Давайце нагадаем, што вывучае раздзел «Словаўтварэнне»?
- Як вы думаеце, якія заданні нас чакаюць на гэтай плошчы?
- Як утвараюцца дзеепрыслоўі закончанага і незакончанага трывання?

*(Пераблытаная схема на экране ці на дошцы).*

**Заданне 2.** Размяркуйце дзеепрыслоўі суадносна іх трывання: 1 варыянт – закончанае трыванне, 2 варыянт – незакончанае трыванне.

***Настаўнік*** *арганізуе ўзаемаправерку (ключ на экране).* ***Вучні*** *абменьваюцца сшыткамі і правяраюць работу суседа па парце, карэкціруюць памылкі. Выстаўляюць бал у ацэначны ліст. Настаўнік цікавіцца вынікамі работы праз сігнальныя карткі[3]. (**Вучні** прэзентуюць сваю работу).*

**Гімнастыка для вачэй** (30 секунд).

*Настаўнік:* І мы працягваем наша падарожжа. Наступны прыпынак — **вуліца Арфаграфічная** (5 хвілін).

*Настаўнік:* Закончыце сказ. Арфаграфія – гэта раздзел мовазнаўства, які вывучае ... Звярніце ўвагу на экран (дошку) (*на экране табліца «Правапіс **не (ня)** з дзеепрыслоўямі», у якой змешчаны толькі прыклады.)*. Карыстаючыся прапанаванымі прыкладамі, раскажыце пра правапіс не (ня) з дзеепрыслоўямі. *(Настаўнік і вучні слухаюць адказ вучня, дапаўняюць.)* Зноў звернемся да маршрутных лістоў.

**Заданне 3.** Прачытайце сказы. Адзначце нумары сказаў, дзе ***не*** трэба пісаць разам (1 варыянт), а дзе асобна (2 варыянт). Вусна растлумачце.

***Вучні*** *выконваюць заданне, правяраюць сябе, ацэньваюць. Настаўнік цікавіцца вынікамі работы праз сігнальныя карткі, высвятляе, у якіх сказах былі допушчаны памылкі і чаму, каменціруе адказы.*

*Настаўнік:* Малайцы! І мы працягваем знаёмства з горадам Дзеепрыслоўе. Вось і **вуліца Пунктуацыйная** (6 хвілін). Скажыце, калі ласка, што вывучае пунктуацыя? Давайце ўзгадаем, калі коска ў сказах з адзіночным дзеепрыслоўем ці дзеепрыслоўным зваротам не ставіцца.

**Заданне 4.** Знайдзіце дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты, пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку. Вусна растлумачце пастаноўку ці адсутнасць знакаў прыпынку.

[2]Адначасова два вучні працуюць на дошцы: адзін вучань працуе з табліцай «Дзеепрыслоўе» (прыём «Белыя плямы»), другі — выбарачны дыктант.

[3]Адначасова два вучні працуюць на дошцы.

***Настаўнік** арганізуе самаправерку, высвятляе, дзе памыліліся дзеці, задае пытанні, слухае адказы, каменціруе. **Вучні** правяраюць, выпраўляюць памылкі, выстаўляюць балы за работу*[4].

*Настаўнік:* Што аб'ядноўвае сказы, з якімі вы працавалі на працягу ўрока? (Адказы вучняў.) Усе яны на тэму прыроды. Таму невыпадкова, што далей мы рушым у **Парк Стылістычны**. Але перад тым, як туды пайсці, давайце паўторым правілы паводзін у прыродзе.

*Правілы паводзін у прыродзе*

**НЕЛЬГА:**

- ламаць галінкі, ссякаць дрэвы, распальваць вогнішчы каля дрэў;
- пакідаць пасля сябе смецце;
- разбураць мурашнікі;
- разбураць птушыныя гнёзды, забіраць з гнёздаў птушанят;
- забіраць з лесу дробных жывёл і птушак: у няволі яны загінуць;
- ірваць расліны, занесеныя ў Чырвоную кнігу;
- збіраць грыбы, вырываючы іх з коранем;
- гучна размаўляць, крычаць, шумець.

**Фізкультхвілінка «Рабі так, як я»** (1 хвіліна).

*Настаўнік:* Вось і **парк Стылістычны** (12 хвілін).

— Што вывучае стылістыка? *(Адказы вучняў).*

*Настаўнік:* Вы паказалі нядрэнныя веды. Аднак практыка паказвае, што ў вусным і пісьмовым маўленні вучні часта ўжываюць дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты няправільна. Абапіраючыся на схемы (на экране ці на дошцы), раскажыце, што мы павінны ведаць, ужываючы дзеепрыслоўі ў вусным і пісьмовым маўленні. *(Адказы вучняў).*

*Настаўнік:* Як паводзіць сябе ў прыродзе, мы ўжо ведаем. А вось чаму мы павінны так сябе паводзіць? На гэтае пытанне нам дапаможа адказаць наступнае заданне. Яго мы будзем выконваць у групах, таму давайце ўспомнім, як трэба працаваць у групе *(памяткі ляжаць на сталах).*

Правілы працы ў групе

1. Настройцеся на сумесную працу.
2. Будзьце добразычлівымі да таварышаў.
3. Памятайце, што вы робіце агульную справу.
4. Адмаўляючы чужое, прапаноўвайце сваё.

**Заданне 5.** Творчая майстэрня.

***Настаўнік** арганізуе працу ў групах. Кожная група выконвае сваё заданне. Калі скласці ўсе заданні разам, атрымаецца тэкст.*

***Настаўнік** арганізуе праверку. **Вучні** прэзентуюць вынікі сваёй працы, правяраюць сказы, выпраўляюць памылкі, працуюць з тэкстам, агульна ацэньваюць работу, выстаўляюць бал у ацэначны ліст*[5].

IV. Падвядзенне вынікаў урока, рэфлексія. (4 хвіліны).

**Прагназуемы вынік:** усведамленне вучнямі выніковасці сваёй дзейнасці і сітуацыі поспеху.

**Задачы настаўніка на этапе:** арганізаваць рэфлексійную сітуацыю, даць якасную ацэнку работы класа і асобных вучняў, забяспечыць самавызначэнне вучняў на выкананне дамашняга задання.

**Спосабы дзейнасці:** індывідуальная, калектыўная.

*Настаўнік:* Вось і скончылася наша падарожжа па горадзе Дзеепрыслоўе. Сёння мы з вамі не толькі прывялі ў пэўную сістэму набытыя веды па тэме «Дзеепрыслоўе», але яшчэ раз трапілі ў цудоўны свет прыроды, які трэба любіць і берагчы. На кожным этапе падарожжа вы атрымлівалі пэўныя балы за выкананыя заданні. Падсумуйце іх і па шкале *(на экране ці на дошцы),* пастаўце сабе адзнаку за ўрок. *(Агучванне адзнак, каментарый настаўніка).*

Мне спадабалася, як вы працавалі. А вы задаволены сваёй працай? *(Сігнальныя карткі).* Паглядзіце ўважліва на тыя мэты, якія мы паставілі на пачатку ўрока, і закончыце сказ:

Сёння я дасягнуў пастаўленых мэт, таму што …

Я добра зразумеў …

У мяне ўзніклі цяжкасці з … , таму дома мне трэба …

V. Дамашняе заданне. (1 хвіліна).

**Прагназуемы вынік:** асэнсаваны выбар дамашняга задання, разуменне вучнямі спосабаў яго выканання.

**Задачы настаўніка на этапе:** дыферэнцыраваць дамашняе заданне, забяспечыць самавызначэнне вучняў на дамашняе заданне, растлумачыць яго выкананне.

**Спосаб дзейнасці:** індывідуальная праца.

С. 120–121 (КПіЗ), пр.214. — да 7 балаў; пр. 214 і 216 — да 8 б.; пр. 215 — да 9 б.; скласці тэкст на тэму «Прырода і мы» (стыль — публіцыстычны, тып — разважанне, 8–10 сказаў, 2–3 дзеепрыслоўі ці дзеепрыслоўныя звароты) — да 10 б.; у праграме learningapps.org скласці тэматычны тэст (10 заданняў) па тэме «Дзеепрыслоўе» — да 10 б.

— Дзякуй вам за добрую працу на ўроку! *(Вучні здаюць маршрутны ліст настаўніку).*

[4] Пры наяўнасці часу 1 вучань на дошцы робіць сінтаксічны разбор 3-га сказа.

[5] Вуснае выказванне (удзельнік алімпіяды) на тэму „Прырода і мы“.

**Дадатак 1**

АПЕРАДЖАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ

1. Што такое дзеепрыслоўе?
2. Якую часціну мовы паясняе?
3. На якія пытанні адказвае?
4. Якім членам сказа з'яўляецца?
5. Граматычныя прыметы якіх часцін мовы мае дзеепрыслоўе?
6. Дзеепрыслоўе як дзеяслоў мае …
7. Дзеепрыслоўе як прыслоўе ….
8. Ці мае дзеепрыслоўе канчатак?
9. Якія дзеепрыслоўі з'яўляюцца зваротнымі?
10. Што такое дзеепрыслоўны зварот?
11. Калі дзеепрыслоўе (дзеепрыслоўны зварот) выдзяляецца коскамі?
12. Калі дзеепрыслоўе коскамі не выдзяляецца?
13. Калі дзеепрыслоўе з **не** пішацца разам?
14. Калі дзеепрыслоўе з **не** пішацца асобна?
15. Як утвараюцца дзеепрыслоўі закончанага трывання?
16. Як утвараюцца дзеепрыслоўі незакончанага трывання?
17. Пры ўжыванні дзеепрыслоўяў звяртаем увагу на:

а) дзеепрыслоўе і дзеяслоў павінны быць …

б) у сказе дзеепрыслоўе і дзеяслоў адносяцца да …

18. Назавіце прыметы публіцыстычнага стылю.
19. Што такое арфаграфія?
20. Што вывучае словаўтварэнне?
21. Што такое пунктуацыя?
22. Што вывучае стылістыка?

**Дадатак 2**

„ЦІ ВЕРЫЦЕ ВЫ, ШТО…"

1. Дзеепрыслоўе – нязменная форма дзеяслова, якая абазначае дадатковае дзеянне і паясняе дзеяслоў-выказнік. — 1
2. Дзеепрыслоўе адказвае на пытанні як? калі? чаму? і інш. — 1
3. Дзеепрыслоўе мае граматычныя прыметы дзеяслова і прыметніка.— 0
4. Дзеепрыслоўі могуць мець зваротную форму. — 1
5. Дзеепрыслоўі могуць ужывацца ў форме цяперашняга, будучага і прошлага часу. — 0
6. Дзеепрыслоўе бывае закончанага і незакончанага трывання. — 1
7. Дзеепрыслоўі мае граматычныя прыметы дзеяслова і прыслоўя. — 1
8. У сказе дзепрыслоўе звычайна выконвае ролю азначэння. — 0
9. Дзеепрыслоўе разам з залежнымі ад яго словамі ўтварае дзеепрыслоўны зварот. — 1
10. У дзеепрыслоўях можна вызначыць канчатак. — 0

**Дадатак 3**

Картка 1.

Выбарачны дыктант.

З прапанаваных слоў выпішыце дзеепрыслоўі (2 хвіліны).

Вусна растлумачце, як адрозніць дзеепрыслоўе ад дзеяслова, ад дзеепрыметніка.

Скасіць, засеяўшы, пасаджаны, падрастаючы, квітнець, задумаўшыся, пажоўклы, ляцець, упрыгожваючы.

*Усяго 5 б. (1 бал за кожны правільны і 1 за вусны адказ).*

Пабудуй апорную схему па тэме „Дзеепрыслоўе". Вусна яе прэзентуй.

*На дошцы замацаваны карткі са словамі:*

Узор: Дзеепрыслоўе …………… форма дзеяслова, якая абазначае … … і адказвае на пытанні ………….

Дзеепрыслоўе мае марфалагічныя прыметы ………. І ……

Як дзеяслоў дзеепрыслоўе …………. Як прыслоўе ………

*Усяго 5 б. (1 бал за кожны правільны і 1 за вусны адказ).*

Картка 2.

Заданне. Ад дадзеных дзеясловаў утварыце дзеепрыслоўі *(праца на дошцы)*:

Памыць, зварыць, гуляць —

*Усяго 3 б. (1 бал за кожны правільны)*

Заданне. Ад дадзеных дзеясловаў утварыце дзеепрыслоўі *(праца на дошцы)*:

Гаварыць, пацямнець, пабяліць —

*Усяго 3 б. (1 бал за кожны правільны)*

**Дадатак 4**

Заданне 5. Творчая майстэрня (3 хвіліны).

*Група 1. Запішыце сказ, замяніўшы дзеяслоў ў дужках дзеепрыслоўем адпаведнага трывання.*

*(Збірацца)* ___________________на адпачынак у лес ці парк, помніце аб правілах паводзін у прыродзе.

<u>Дадатковыя заданні</u>

*Дайце характарыстыку дзеепрыслоўю.*

<u>Гл. падручнік стар.89.</u>

*Усяго 4 б. на групу: размеркаваць суадносна працы.*

Заданне 5. Творчая майстэрня (3 хвіліны).

Група 2. Запішыце сказы, замяніўшы дзеясловы ў дужках дзеепрыслоўямі адпаведнага тры-

вання.

*(Ламаць)*___________________галінкі, *(ссякаць)*_____________ дрэвы, вы наносіце сур'ёзную шкоду лясам.

*(Разбураць)* ______________________гнёзды птушак, мурашнікі, вы разбураеце дом сваіх сяброў.

*Усяго 4 б. на групу: размеркаваць суадносна працы.*

Дадатковыя заданні

- Назавіце дзеепрыслоўныя звароты. Якім членам сказа яны з'яўляюцца?
- Што агульнага ва ўжытых дзеепрыслоўях?

Заданне 5. Творчая майстэрня (3 хвіліны).

Група 3. Запішыце сказы, замяніўшы дзеясловы ў дужках дзеепрыслоўямі адпаведнага трывання.

*(Пакідаць)* _____________________пасля сябе сме**цц**е, прыносіце шкоду **ў**сёй л**я**сной экалагічнай* сістэме.

Такім ч**ы**нам, *(знішчаць)* ________________прыроду, мы знішчаем сябе.

Дадатковыя заданні

- *Што такое экалогія? (Гл. тлумачальны слоўнік.)*
- *Растлумачце правапіс выдзеленых літар.*

*Усяго 4 б. на групу: размеркаваць суадносна працы.*

Заданне 5. Творчая майстэрня (3 хвіліны).

Група 4. Збіраючыся на адпачынак у лес ці парк, помніце аб правілах паводзін у прыродзе. Ламаючы галінкі, ссякаючы дрэвы, вы наносіце сур'ёзную шкоду лясам. Разбураючы гнёзды птушак, мурашнікі, вы разбураеце дом сваіх сяброў. Пакідаючы пасля сябе смецце, прыносіце шкоду ўсёй лясной экалагічнай сістэме. Такім чынам, знішчаючы прыроду, мы знішчаем сябе.

Дадатковыя заданні да тэксту

*Тэкст зачытваецца ўголас.*

- *Да якога стылю адносіцца тэкст? Чаму?*
- *Дайце загаловак тэксту.*
- *Што адлюстроўвае ваш загаловак: тэму ці асноўную думку?*
- *У тэксце шмат дзеепрыслоўяў? Чым абумоўлена іх ужыванне?*

(Гл. падручнік, стар.103)

*Усяго 4 б. на групу: размеркаваць суадносна працы.*

Маршрутны ліст вучня (вучаніцы)

7 "___" класа

_______________________________________

Абагульняючы ўрок па тэме „Дзеепрыслоўе"

Пасля ўрока я буду ведаць:

- агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю дзеепрыслоўяў;
- правілы ўтварэння, напісання дзеепрыслоўяў;
- выдзялення дзеепрыслоўяў і дзеепрыслоўных зваротаў знакамі прыпынку;
- буду ўмець:
- утвараць розныя формы дзеепрыслоўяў;
- правільна пісаць суфіксы дзеепрыслоўяў; не (ня) з дзеепрыслоўямі;
- распазнаваць у тэксце дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты, вызначаць іх ролю ў тэкстах;
- правільна ўжываць дзеепрыслоўі ва ўласным маўленні.

Праспект Тэарэтычны

1. Лічбавы дыктант

| № | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | *Усяго 5 б. (0,5 за кожны правільны)* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Адказ | | | | | | | | | | | |

Плошча Словаўтваральная

Заданне 2. Размяркуйце дзеепрыслоўі суадносна іх трыванню: 1 варыянт — закончанае трыванне, 2 варыянт – незакончанае трыванне. (2 хвіліны)

Ідучы, бегаючы, даказаўшы, разгледзеўшы, дапамогшы, седзячы, сабраўшы, везучы, выехаўшы, бачачы, гледзячы, прыняўшы.

| 1 варыянт | 2 варыянт |
|---|---|
| Дзеепрыслоўі незакончанага трывання<br>______________________<br>______________________<br>______________________<br>______________________<br>______________________<br>______________________<br>*Усяго 3 б. (0,5 за кожны правільны):* | Дзеепрыслоўі закончанага трывання<br>______________________<br>______________________<br>______________________<br>______________________<br>______________________<br>______________________<br>*Усяго 3 б. (0,5 за кожны правільны):* |

Вуліца Арфаграфічная

Заданне 3. Прачытайце сказы. Адзначце нумары сказаў, дзе **не** трэба пісаць разам (1 варыянт), а дзе асобна (2 варыянт). Вусна растлумачце. (2 хвіліны)

1. (Не) пераскочыўшы, не кажы гоп.
2. (Не) навідзячы іншых, паглядзі на сябе.
3. (Не) навучыўшыся сам, не вучы каго іншага.
4. (Не)  пакоячыся пра сваіх дзяцей, птушкі спяшаліся да сваіх гнёздаў.
5. Пчолка маленькая, а жыве (не) гуляючы.
6. (Не) давыканаўшы заданне, мы памчаліся на рэчку.

Разам___________Асобна _________

*Усяго 3 б. ( 1  за кожны правільны).*

Вуліца Пунктуацыйная

Заданне 4. Знайдзіце дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты, пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку. Вусна растлумачце пастаноўку ці адсутнасць знакаў прыпынку. (3 хвіліны)

1. Дрэвы стаялі не варушачыся.
2. Распластаўшы белыя крылы  буслы спакойна і велічна плылі круг за кругам.
3. Дзьмуў лёгкі ветрык зганяючы спякоту.
4. Пчолы адчуўшы цяпло вясны высыпалі з вулля.
5. Мы слухалі спеў жаваранка затаіўшы дыханне.

*Усяго 5 б. (1 за кожны правільны).*

Парк Стылістычны

*Праца ў групах*

*Усяго 4 б. на групу: размеркаваць суадносна працы*

Ацэначны ліст

| Назва прыпынку | | Набрана балаў | Адзнака за ўрок |
|---|---|---|---|
| Праспект Тэарэтычны | Заданне 1. | | |
| Плошча Словаўтваральная | Заданне 2. | | |
| Вуліца Арфаграфічная | Заданне 3. | | |
| Вуліца Пунктуацыйная | Заданне 4. | | |
| Парк Стылістычны | Заданне 5. | | |
| *Дадатковы бал* | | | |
| Усяго набрана балаў: | | | |

**Шкала поспеху**

| Набрана балаў | Адзнака за ўрок |
|---|---|
| 18 балаў і больш | **10** |
| 17 балаў | **9** |
| 15–16 балаў | **8** |
| 13–14 балаў | **7** |
| 11–12 балаў | **6** |
| 9–10 балаў | **5** |
| 7–8 балаў | **4** |
| 5–6 балаў | **3** |

*Жадаю Вам поспехаў!*